# ПАРАДАК БЕЗ ПРАЗМЕРНАСЦЯЎ

**Учора Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Беларусі Ігара Шуневіча. На сустрэчы разглядалася сітуацыя ў краіне па лініі Міністэрства ўнутраных спраў, хакей і падрыхтоўка да II Еўрапейскіх гульняў. Менавіта з апошняй тэмы пачалася сур'ёзная размова.**

## Абаронім і без плота

«Мяне насцярожвае, што мы, не думаючы часам, у плане перастрахоўкі ці яшчэ чагосьці пачынаем ствараць ці то канцлагеры, ці то нейкія гета ў Беларусі. Сёння ўжо гляджу: аж да праезнай часткі выставілі падмурковыя блокі, чытай, будзем усталёўваць металічныя платы ў раёне фан-зон. Гэта нам навошта?» — задаўся пытаннем беларускі лідар.

«Няхай гэта робяць у краінах з дэмакратыяй — у Францыі, Германіі, яшчэ недзе, у Амерыцы. А ў нас гэта рабіць не трэба, мы павінны працаваць так, каб людзі свабодна маглі мець зносіны ў перыяд гэтых Еўрапейскіх гульняў і пасля. Гэта значыць, празмернасцяў не павінна быць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: яго словы не азначаюць тое, што не трэба аддаваць увагу бяспецы як жыхароў краіны, так і турыстаў. «Але мы ўмеем гэта рабіць без платоў. Я ведаю, што гэта прэтэнзіі і прапановы еўрапейскіх чыноўнікаў. Трэба ім прама казаць, што мы забяспечым без іх бяспеку прыезджых і сваіх грамадзян. Мы гэта ўжо рабілі. Не трэба перагараджваць Мінск на гэты час у сістэму нейкіх платоў», — адзначыў беларускі лідар.

Ён заклікаў МУС па дадзенай тэме кіравацца рэкамендацыямі мэра Мінска Анатоля Сівака і кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай, якія цалкам нясуць адказнасць за гэта.

## Дадзім дарогу беларусам

Таксама беларускі лідар адзначыў, што хацеў бы пачуць справаздачу і аб сітуацыі ў спорце, у прыватнасці аб хакейным «Дынама-Мінск».

«Пры гэтым хачу, каб усе разумелі і вы: мы не збіраемся фінансаваць легіянераў», — канстатаваў ён. Кіраўнік дзяржавы заклікаў прыцягваць айчынных хакеістаў, а з дапамогай трох-чатырох легіянераў закрываць праблемныя пазіцыі — напрыклад, варатар ці хакеіст у першую тройку. «Але трэба ставіць сваіх і гуляць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

У канцы лютага — пачатку сакавіка мінскае «Дынама» згуляла суперсерыю супраць зборнай клубаў экстралігі. Па словах беларускага лідара, рашэнне арганізаваць гэты турнір было прынята невыпадкова. «Я думаю, вы самі бачылі, што нашы ні ў чым не саступалі тым дынамаўцам, якія гулялі ў мінулым сезоне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Хочуць гуляць і грошы зарабляць — што тут грэх таіць — няхай ідуць і гуляюць. Не могуць — значыць, няма чаго з імі размаўляць. Я кажу пра беларусаў. А цягнуць сюды легіянераў з усяго свету і ў плэй-оф не трапляюць — нам такія гульні не трэба», — падкрэсліў ён і дадаў, што з-за апошніх вынікаў сапраўды перажываюць заўзятары.

Такім чынам, усё павінна быць накіравана на развіццё беларускага спорту і ў прыватнасці хакея, рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### У тэму

По выніках сустрэчы з кіраўніком дзяржавы міністр унутраных спраў пагутарыў з прадстаўнікамі СМІ.

Паводле яго слоў, ужо сёння можна сказаць, што Міністэрства ўнутраных спраў са стапрацэнтнай гатоўнасцю падыходзіць да гэтых спаборніцтваў. Створаны неабходныя рэзервы, атрыманая тэхніка, праведзены інструктажы і навучанне асабовага складу — міністр запэўніў, што парадак і бяспека будуць забяспечаны на найвышэйшым узроўні.

Што датычыцца аператыўнай абстаноўкі, Ігар Шуневіч адзначыў значны рост выяўленых кіберзлачынстваў за 5 месяцаў бягучага года. Так, у два разы ў параўнанні з леташнім пакачыкам павялічылася колькасць крадзяжоў з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі.

Паводле ацэнкі МУС, такі від злачынстваў будзе развівацца і далей, таму Ігар Шуневіч унёс кіраўніку дзяржавы прапанову аб перамеркаванні штатнай колькасці, каб павялічыць колькасць спецыялістаў, якія будуць займацца расследаваннем злачынстваў у IT-сферы.

## Ігар Шуневіч сышоў з пасады міністра ўнутраных спраў

У завяршэнні размовы з журналістамі міністр зрабіў заяву.

«Сёння я звярнуўся да кіраўніка дзяржавы з рапартам аб адстаўцы, і ён гэтую адстаўку прыняў, — сказаў Ігар Шуневіч. — Так што, спадзяюся на тое, што я змагу яшчэ прынесці карысць нашай дзяржаве на іншай пасадзе або на іншай рабоце».

Ён назваў гэтае рашэнне вывераным, правільным і своечасовым. «Таму жыццё працягваецца, жаданне і магчымасць працаваць ёсць. Суперэкстраардынарнага ў гэтай сітуацыі я не бачу абсалютна нічога. Усё развіваецца па спіралі», — адзначыў Ігар Шуневіч.

«Сядзець склаўшы рукі я дакладна не буду, але, яшчэ раз падкрэсліваю, спадзяюся быць карысным дзяржаве на любой пасадзе», — дадаў ён.

На пытанне аб тым, ці захаваў ён пасаду старшыні наглядальнага савета ХК «Дынама-Мінск», Ігар Шуневіч сказаў «пакуль так».

---

Падзея

# «ФІНАНСАВЫ» ВІЗІТ У ЛОНДАН

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас узяў удзел у Дні рынкаў капіталу Беларусі (Belarus Capital Markets Day), які прайшоў на Лонданскай фондавай біржы, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Гэта значнае для Беларусі мерапрыемства на адной з найбуйнейшых фінансавых пляцовак свету з бездакорнай рэпутацыяй і самымі высокімі стандартамі якасці. «Гэтай падзеяй мы паказваем цікавасць да пашырэння прысутнасці на міжнародных рынках», — падкрэсліў кіраўнік урада. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што Беларусь — дзяржава з адкрытай эканомікай, 2/3 выраблёнай прадукцыі экспартуецца, і краіна не можа быць у баку ад падзей, эканамічных працэсаў, якія адбываюцца ў свеце. Паводле яго слоў, сёння ў эканоміцы Беларусі пазначыліся новыя пункты росту. Нароўні з традыцыйна моцнымі галінамі-брэндамі (машынабудаванне, сельская гаспадарка, харчовая прамысловасць) актыўна развіваецца сфера паслуг — транспартна-лагістычная галіна, турызм.

Найбольш перспектыўным Сяргей Румас назваў IT-сектар. «Яго імклівы рост (30 % у год) і экспартны патэнцыял пераўзыходзяць любую іншую галіну эканомікі. Рашэнне аб развіцці ў Беларусі лічбавай эканомікі прынята на вышэйшым узроўні», — адзначыў прэм'ер-міністр. Цэнтрам развіцця беларускага IT-сектара з'яўляецца Парк высокіх тэхналогій. Тут створаны беспрэцэдэнтныя льготы і гарантыі для рэзідэнтаў. «І інвестары паверылі нам. Сёння на Дні рынкаў капіталу Беларусі IT-сектару прысвечаны асобны блок. Мы хочам прадэманстраваць, што, называючы Беларусь «Сіліконавай далінай Усходняй Еўропы», журналісты The Wall Street Journal ніколькі не перабольшвалі», — падкрэсліў Сяргей Румас.

Ён нагадаў, што Беларусь у 2017 годзе вярнулася на міжнародны фінансавы рынак з суверэннымі еўрааблігацыямі. Акрамя таго, карпаратыўным пазычальнікам на знешнім рынку стала кампанія «Еўрагандаль». Сёлета дэбютныя здзелкі па размяшчэнні еўрааблігацый здзейсніў спецыялізаваны фінансавы інстытут — Банк развіцця Беларусі, ён размясціў не толькі класічны выпуск у доларах, але таксама першы і знакавы для краіны выпуск еўрааблігацый у беларускіх рублях. «Відавочна, што прысутнасць эмітэнтаў з Беларусі на міжнародным фінансавым рынку будзе пашырацца», — мяркуе Сяргей Румас.

Вялікабрытанія з'яўляецца адным з асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі. Апошнія некалькі гадоў яна ўстойліва займае трэцяе месца па экспарце беларускіх тавараў. У студзені — красавіку 2019 года двухбаковы тавараабарот склаў больш як $1 млрд, сальда склалася станоўчае для Беларусі ў памеры $843,3 млн. Вялікабрытанія займае другое месца па аб'ёме прамых замежных інвестыцый (31,7 %) у эканоміку Беларусі. З улікам ролі Лондана як сусветнага фінансавага цэнтра беларускі бок бачыць вялікі патэнцыял для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы банкаўскай справы і фінансаў.

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, сёння ў Сяргея Румаса ў Лондане запланаваны шэраг сустрэч, у тым ліку з кіраўніцтвам Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, міністэрстваў замежных спраў і знешняга гандлю Вялікабрытаніі.

**Ул. інф.**

---

Блізкая ўлада

# Пра актуальнае і спецыфічнае

## Уладзімір КРАЎЦОЎ адказаў на пытанні жыхароў Гродзенскай вобласці

**Як адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама, пытанні падчас прамой тэлефоннай лініі ў многім застаюцца традыцыйнымі і датычацца службы ЖКГ. Але зараз іх спецыфіка абумоўлена цёплым і нават гарачым надвор'ем. У сувязі з гэтым узрастае расход вады, узнікае яе дэфіцыт.**

З такой праблемай, у прыватнасці, звярнуліся жыхары населенага пункта Каробчыцы Гродзенскага раёна. Тут вядзецца актыўнае будаўніцтва жылля, але ёсць праблемы з інжынернымі сеткамі. Жыхары просяць паспрыяць іх вырашэнню. Па словах Уладзіміра Краўцова, паступова гэтыя пытанні вырашаюцца. У прыватнасці, завяршаецца ўзвядзенне водаправодных сетак, заключаюцца дагаворы з мясцовым насельніцтвам па цэнтралізаванай сістэме падачы вады і адыходу ад свідравін і калодзежаў. Ужо ёсць праектна-каштарысная дакументацыя, каб злучыць водаправодныя сеткі з гарадскімі і зняць гэта напружанае пытанне.

Праблему экалагічнага характару агучыў падчас прамой лініі жыхар Свіслачы. У яго роднай вёсцы Жаркаўшчына ёсць невялікае возера, плошча якога адзін гектар. Раней яго чысцілі, добраўпарадкавалі, тут вадзілася рыба. Але цяпер, заўважае Аляксей Андрэевіч, возера зарастае хмызняком, яго ніхто не даглядае. Мясцовыя жыхары звярталіся ў розныя інстанцыі, але пакуль безвынікова. У сваю чаргу, яны гатовы далучыцца да гэтай справы і нават дапамагчы фінансава.

— Апошнім часам многія звяртаюцца з праблемамі навядзення парадку, экалогіі, што актуальна ў Год малой радзімы. Прыемна, што людзі неабыякавыя да стану сваіх мясцін і жадаюць навесці парадак, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. — А іх жаданне далучыцца да ачысткі вадаёмаў, рачулак, крыніц сведчыць аб тым, што агульнымі намаганнямі гэтыя праблемы будуць вырашацца.

Такая сітуацыя датычыцца і захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Апошнім часам колькасць зваротаў у гэтым кірунку расце. Прычым жыхары не проста выказваюць крытычныя заўвагі, маўляў, штосьці там не робіцца — прымайце меры. Многія выступаюць са сваімі канструктыўнымі прапановамі, на якія мясцовыя ўлады звяртаюць увагу, зазначыў Уладзімір Краўцоў. Такі падыход дапамагае шырокамаштабнай рабоце, якая вядзецца па захаванні культуры, традыцый і тых аб'ектаў, якія дайшлі да нашых часоў. Многія з іх узноўлены, і гэта работа працягваецца.

— Выкарыстоўваюцца розныя крыніцы фінансавання. Гэта не толькі бюджэтныя сродкі — рэгіён прымае актыўны ўдзел у розных міжнародных праектах. Ёсць дзяржаўныя праграмы, і ў Фондзе падтрымкі Прэзідэнта прадугледжаны сродкі на аб'екты культуры і гісторыі, ёсць і іншыя паступленні, — паведаміў Уладзімір Краўцоў. — Галоўнае — актыўна працаваць і ўмела выкарыстоўваць фінансы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Аргенціна і Бразілія задумаліся аб увядзенні агульнай валюты



Адпаведныя планы анансаваныя падчас візіту ў Буэнас-Айрэс прэзідэнта Бразіліі Жаіра Балсанару і міністра эканомікі Паўлу Гедэса ў ходзе сустрэчы з дзелавымі коламі Аргенціны. Пра гэта паведаміла бразільская газета Globo. Як расказалі выданню крыніцы ў прадпрымальніцкіх колах, такі макраэканамічны праект прапаноўваўся і раней. На іх думку, ён з'яўляецца натуральным працягам збліжэння палітычных пазіцый дзвюх дзяржаў, дзе раней ва ўладзе адначасова знаходзіліся левыя палітычныя сілы, якіх цяпер у Буэнас-Айрэсе і Бразіліі змянілі правыя. Рабочая назва будучай валюты — песа рэале, яна складзена з назваў цяперашніх грашовых адзінак паўднёваамерыканскіх рэспублік (песа — валюта Аргенціны, рэал — Бразіліі).

## Часовы прэзідэнт Алжыра мае намер заставацца ва ўладзе да новых выбараў



Часовы прэзідэнт Алжыра Абдэлькадэр Бенсалах заявіў пра намер заставацца ва ўладзе да новых выбараў. Ён выступіў са зваротам да нацыі, які трансляваў тэлеканал Al Hadath. Бенсалах заклікаў «усе палітычныя сілы і грамадзянскую супольнасць устаць на шлях дыялогу». «Нам трэба, каб усе аб'ядналіся дзеля таго, каб супрацьстаяць выклікам, якія стаяць перад намі, — падкрэсліў часовы кіраўнік дзяржавы. — Выбары — гэта найлепшы спосаб вырашэння ўнутрыпалітычнага крызісу ў Алжыры». Па словах Бенсалаха, «краіна патрабуе рэформаў ва ўсіх сферах, у тым ліку палітычнай і эканамічнай», перадае ТАСС. Пры гэтым часовы прэзідэнт не назваў дату правядзення галасавання. Як вядома, 2 чэрвеня Канстытуцыйны савет Алжыра аб'явіў пра немагчымасць правядзення прэзідэнцкіх выбараў у краіне ў першапачаткова запланаваную дату 4 ліпеня.

## Google здзейсніла найбуйнейшую здзелку



Кампанія Google дамовілася аб куплі кампаніі Looker, якая працуе ў сферы воблачных рашэнняў, паведаміла прэс-служба найбуйнейшага пошукавіка. Агульная сума здзелкі складае 2,6 мільярда долараў і будзе поўнасцю аплачана наяўнымі сродкамі. Удакладняецца, што, як толькі пагадненне аб куплі будзе афармлена і адбудзецца здзелка, Looker увойдзе ў склад Google Cloud. Адбудзецца гэта не раней за канец бягучага года. Удакладняецца, што набыццё Looker стане для Google найбуйнейшай здзелкай, пачынаючы з 2014-га.